Мы разам — Беларусь!
Краіна моцная рэгіёнамі: Гомельская вобласць, Мазырскі раён

Мазыршчына — бязмежжа магчымасцяў

Сёння Мазырскі раён — адзін з буйных індустрыяльных і сельскагаспадарчых цэнтраў Гомельскай вобласці. Сваімі поспехамі ў эканоміцы, сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, спорце, грамадскім і культурным жыцці ён спрыяе павышэнню аўтарытэту ўсёй краіны. Старшыня райвыканкама Алена ПАЎЛЕЧКА заўважае, што ёсць усе падставы лічыць вынікі работы Мазырскага раёна летась паспяховымі:

— Мазырскі раён уваходзіць у тройку самых буйных прамысловых цэнтраў Гомельскай вобласці. Прамысловы сектар раёна складаецца з 24 прадпрыемстваў, якія прадстаўляюць практычна ўсе галіны народнай гаспадаркі. Асноўныя з іх: нафтаперапрацоўка, вытворчасць малочных і мясных прадуктаў, здабыча і вытворчасць прадукцыі на аснове солі, мэблевая і дрэваапрацоўчая вытворчасць, вытворчасць і рамонт машын і абсталявання, вытворчасць кабеляў, швейная вытворчасць. Удзельная вага вытворчасці прамысловай прадукцыі раёна складае 40,5 % ад аб'ёму прамысловай вытворчасці вобласці.

Мазырскі раён — адзін з самых буйных у Гомельскай вобласці. Яго плошча — 160 тысяч гектараў. Больш за палову тэрыторыі пакрыта лясамі. Насельніцтва складае 133 тысячы чалавек.

Усімі прадпрыемствамі праведзена мадэрнізацыя. За мінулы год колькасць грамадзян, працаўладкаваных на новыя працоўныя месцы, склала 300 чалавек. Дарэчы, летась у раёне створана 38 арганізацый, з іх 12 — у вытворчай сферы. Рэалізацыя мер па забеспячэнні занятасці насельніцтва дазволіла паменшыць узровень беспрацоўя да 0,7 %. На пачатак года каэфіцыент напружанасці на рынку працы — 0,5. Сёлета плануецца працаўладкаваць звыш 500 чалавек.

Паспяхова вырашаецца задача адраджэння вёскі. Важна, каб маладыя людзі не з'язджалі ў горад, а заставаліся жыць і працаваць у раёне. Будаўніцтва жылля на вёсцы дазваляе прыцягнуць працоўныя кадры, забяспечыць людзей годнай заработнай платай, стварыць нармальныя ўмовы для іх пражывання. Актыўна развіваюцца жывёлагадоўля. Па выніках работы за мінулы год сельскагаспадарчымі арганізацыямі Мазырскага раёна паказчык па тэмпе росту вытворчасці валавой прадукцыі пры заданні 102 % фактычна выкананы на 107,8 %. Мазырскі раён — лідар у вобласці па прадукцыйнасці сельскагаспадарчых жывёл. Па выніках працы за 2017 год на адну карову надоена 6480 кг малака. Сярэднясутачныя прыбаўленні ў вазе буйной рагатай жывёлы склалі 738 грамаў, свіней — 622 грамы.

У раёне ажыццяўляе дзейнасць 3486 суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Ад іх дзейнасці ў бюджэт раёна летась паступіла 40 млн рублёў. Доля паступленняў падатковых плацяжоў у раённы бюджэт ад малога і сярэдняга бізнесу складае каля 20 %.

Ёсць пэўныя поспехі ў будаўнічай галіне, якая ўключае больш за 25 арганізацый. За 2014—2017 гады ўведзена ў эксплуатацыю 266,401 тысячы кв. м жылля. У тым ліку з дзяржаўнай падтрымкай — 76,3 тысячы кв. м. З іх 83 % — для шматдзетных сем'яў. За апошнія чатыры гады ў раёне ўведзены аб'екты сацыяльнага значэння: дзіцячы яслі-сад на 300 месцаў і рэканструяваны будынак пад вучылішча алімпійскага рэзерву.

Ахова здароўя ўключае 19 арганізацый. Дыспансернымі медыцынскімі аглядамі ў 2017 годзе было ахоплена 99,1 % дарослага насельніцтва. Ахоп дыспансерызацыяй дзяцей штогод складае 100 %.

ВІЗІТОЎКА СТАРШЫНІ МАЗЫРСКАГА РАЙВЫКАНКАМА

Алена Паўлечка — адна з нямногіх жанчын у краіне, якія ўзначальваюць раённую вертыкаль улады.

Алена Фёдараўна пачынала працоўную дзейнасць там, дзе нарадзілася, — у Нараўлянскім раёне: бухгалтарам у саўгасе «Кіраўскі». Там жа з бухгалтара вырасла да галоўнага эканаміста. Завочна скончыла Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію.

Аварыя на Чарнобыльскай АЭС унесла карэктывы ў жыццё тысяч людзей, у тым ліку і жыхароў яе роднай вёскі Кіраў. Населены пункт трапіў у спіс на першачарговае перасяленне. Так, у 1995 годзе яна з сям'ёй пераехала ў Мазырскі раён. У яе працоўнай біяграфіі — кіраўнічыя пасады ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі і харчавання Мазырскага райвыканкама. У 2016 годзе Алена Паўлечка ўзначаліла Мазырскі райвыканкам.

Сістэма адукацыі прадстаўлена 83 установамі адукацыі. Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі навучаецца 14,5 тысячы навучэнцаў. У дашкольных установах — звыш 6 тысяч дзяцей. З 2014 па 2017 год школьнікі раёна ўзнагароджаны 189 дыпломамі трэцяга, 28 — заключнага этапаў рэспубліканскай алімпіяды.

На 2018 год вызначаны напружаныя заданні ва ўсіх сферах сацыяльна-эканамічнага развіцця. Сёлета неабходна забяспечыць нарошчванне экспарту тавараў і паслуг у цэлым па раёне не ніжэй за ўзровень мінулага года, у тым ліку дасягнуць тэмпу росту па экспарце тавараў без уліку нафты і нафтапрадуктаў, а таксама без уліку арганізацый, падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржкіравання, не менш за 105,5 %, па экспарце паслуг — не менш за 104,5 %; прыцягненне ў эканоміку раёна прамых замежных інвестыцый павінна скласці не менш за $42,5 млн.

Кіраўнікі мазырскай студыі цыркавога мастацтва «Арэна» Марыя і Барыс КУЗНЯЦОВЫ нядаўна ўзнагароджаны медалямі Францыска Скарыны. Мазыране таксама ўвайшлі ў лік 100 найлепшых беларусаў мінулага года. Удзельнікі заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь «Студыя цыркавога мастацтва «Арэна» неаднаразова заваёўвалі Гранд-прэміі, станавіліся лаўрэатамі і дыпламантамі міжнародных фестываляў і конкурсаў. Многія з іх маюць прэміі спецыяльнага Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Асноўная задача кіраўніцтва рэгіёна — паляпшэнне якасці жыцця яго насельніцтва, забеспячэнне належнай заработнай платы. Для гэтага мы павінны сканцэнтраваць сваю ўвагу на павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці, рацыянальным выкарыстанні абаротных сродкаў, рэалізацыі прадукцыі, у тым ліку на экспарт. На Мазыршчыне ёсць высокакваліфікаваныя кадры. Сумеснымі намаганнямі мы зробім наш раён яшчэ прыгажэйшым і ўпішам у яго гісторыю шмат новых выдатных старонак.

ЯК СТАЦЬ ПЕРАМОЖЦАМ У ІТ-СФЕРЫ?

Пра гэта ведаюць у Цэнтры юных пажарных горада Мазыра. У 1991-м — годзе заснавання — тут давалі ў першую чаргу веды па бяспечнай жыццядзейнасці, адсюль пайшла і замацавалася назва ўстановы. Ну а праз два гады ўзнік гурток па праграмаванні, які ўзначаліў у той час яшчэ студэнт Аляксей Баруноў.

Дырэктар Цэнтра юных пажарных Аляксандр БАРАВІК паказвае памяшканні, дзе і цяпер займаюцца выхаванцы. Кожны ганарыцца, калі яго здымак трапляе ў галерэю, якая размяшчаецца ўздоўж крутой лесвіцы, што вядзе ў класы. Чым вышэй — тым большыя дасягненні тых, чые выявы на фота. У аўдыторыях на паліцах — старажытныя «мышкі» і мацярынскія платы, на падлозе — гантэлі і іншыя трэнажоры для падтрымання фізічнай формы. Здагадваешся, што не «батанікі» растуць.

Педагог дадатковай адукацыі Аляксей Баруноў між тым падышоў да справы сур'ёзна. За чвэрць стагоддзя ён стварыў у Мазыры моцную школу юных айцішнікаў, якую ведаюць не толькі ў краіне, але і ва ўсім свеце. Аляксей Валянцінавіч — адзін з трэнераў абласной каманды школьнікаў па праграмаванні, шматразовы лаўрэат Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Пачыналі з распрацоўкі праграм для штогадовых тыдняў навукі і тэхнічнай творчасці, але хутка даведаліся пра спартыўнае праграмаванне і цяпер захапляюцца ім.

Першую сур'ёзную перамогу — 3-е месца — школьнікі з Мазыра атрымалі ў 2007 годзе. Тады Аляксей Ропан, Яўген Грыцкевіч і Аляксандр Куліцкі прывезлі «золата» Усерасійскай каманднай алімпіяды школьнікаў па праграмаванні ў Санкт-Пецярбургу. Пасля перамог і медалёў самай высокай вартасці стала значна больш. Асабліва тут ганарацца дасягненнямі Сяргея Куліка і Адама Бардашэвіча. Цяпер у мазырскага цэнтра 45 дыпломаў заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па інфарматыцы, 17 дыпломаў маскоўскай Адкрытай алімпіяды школьнікаў па праграмаванні, восем дыпломаў і чатыры медалі Усерасійскай каманднай алімпіяды школьнікаў па праграмаванні, сем медалёў на міжнародных алімпіядах школьнікаў па інфарматыцы.

Некаторыя выпускнікі цэнтра ўваходзяць у лік самых моцных праграмістаў свету. Як і 25 гадоў таму, на заняткі можна прыйсці «з вуліцы». Затрымліваюцца, зразумела, не ўсе, але ж з самымі руплівымі будуць займацца індывідуальна. Бясплатна. Тут ёсць своеасаблівая іерархія. Малодшая, сярэдняя і старэйшая групы. У апошняй — тыя, хто дасягнуў вынікаў на рэспубліканскіх ці міжнародных алімпіядах. У кожнага свой тэмп навучання, ёсць складаная сістэма рэйтынгаў і матывацыі для дзяцей згодна з іх узростам. Адзнак няма, але той, хто прайшоў далей па праграме навучання, мае права заняць больш магутны камп'ютар. Рэйтынгі ўвесь час абнаўляюцца, а дзеці пастаянна спаборнічаюць паміж сабой. Часцей перамагаюць не тыя, каму ўсё лёгка даецца, а тыя, хто мэтанакіраваны і гатовы ўпарта працаваць.

Большасць былых вучняў мазырскага Цэнтра юных пажарных зараз працуе ў ІТ-сферы. Яны раз'ехаліся па розных гарадах Беларусі і Расіі. А педагог Аляксей Баруноў не збіраецца кідаць свой праект і працягвае ставіць задачы перад школьнікамі, якія, магчыма, выведуць іх асабіста і ўсю нашу краіну на прынцыпова новы ўзровень.

Апошнія дасягненні:

* У снежні на XVIII Усерасійскай алімпіядзе школьнікаў па праграмаванні ў Санкт-Пецярбургу дзве каманды мазыран (КЮП#1 — Дзяніс Піваваpаў, Аляксандр Крывашэеў, Сяргей Піскун і КЮП#4 — Іван Рэўт, Арцём Ганчарук, Вячаслаў Акуленка) атрымалі дыпломы III ступені Міністэрства адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі.

* Дзяніс Піваваpаў заваяваў сярэбраны медаль па інфарматыцы на XIV Міжнароднай Жаўтыкоўскай алімпіядзе па матэматыцы, фізіцы і інфарматыцы, якая праходзіла з 10 па 15 студзеня ў Алматы (Казахстан).

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

У ЗІМОВІШЧАХ ЗАБАВЫ ЗІМОВЫЯ

У вясковай школе вёскі Малыя Зімовішчы — 31 вучань, і кожны палічыў неабходным паспрабаваць сябе гэтай зімой у якасці спартсмена.

Некаторыя нават спецыяльна да адкрыцця катка заказвалі бацькам падарунак — канькі. Астатнім на адкрыццё ў якасці бонусу канькі прывезлі прадстаўнікі аддзела адукацыі Мазырскага райвыканкама. Дарэчы, катацца многія навучыліся яшчэ на асфальце — на ролікавых. Дырэктар зімовіцкай базавай школы Мікалай Ліпскі гаворыць, што цяпер разам з дзецьмі на ледзяную пляцоўку выходзяць і бацькі:

— Забаў у вёсцы не вельмі шмат, а вось каток — выдатнае баўленне часу. Асабліва калі ён яшчэ і на тэрыторыі школы. І зроблены сваімі сіламі з дапамогай спонсараў.

Каб было зручна, на катку ўсталявалі ліхтар для асвятлення. Зімой цямнее рана, і такім чынам удалося працягнуць час знаходжання на аматарскай спартыўнай пляцоўцы. А яшчэ бацькі вельмі ўдзячныя, што іх дзеці цяпер менш часу праводзяць у інтэрнэце.